# Парадак і тэрміны
# абскарджання адміністрацыйнага рашэння

**<u>Парадак абскарджання адміністратыўнага рашэння:</u>**

1. Зацікаўленая асоба валодае правам на абскарджанне адміністрацыйнага рашэння ў адміністрацыйным (пазасудовым) парадку.

2. Адміністрацыйная скарга накіроўваецца ў дзяржаўны орган, іншую арганізацыю, вышэйстаячыя ў адносінах да ўпаўнаважанага органа, які прыняў адміністрацыйнае рашэнне, або ў дзяржаўны орган, іншую арганізацыю, да кампетэнцыі якіх у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі адносіцца разгляд такіх скарг (далей - орган, які разглядае скаргу ).

3. Абскарджанне адміністрацыйнага рашэння ў судовым парадку ажыццяўляецца пасля абскарджання такога рашэння ў адміністрацыйным (пазасудовым) парадку, калі іншы парадак абскарджання не прадугледжаны заканадаўчымі актамі.

Абскарджанне адміністрацыйнага рашэння ў судовым парадку ажыццяўляецца ў адпаведнасці з грамадзянскім працэсуальным ці гаспадарчым працэсуальным заканадаўствам.

4. Падача скаргі ў адміністрацыйным (пазасудовым) парадку не пазбаўляе зацікаўленую асобу права на зварот са скаргай у суд.

**<u>Тэрмін падачы адміністратыўнай скаргі</u>**

1. Адміністрацыйная скарга можа быць пададзена ў орган, які разглядае скаргу, на працягу аднаго года з дня прыняцця адміністрацыйнага рашэння, якое абскарджваецца.

2. Орган, які разглядае скаргу, мае права аднавіць тэрмін падачы адміністрацыйнай скаргі ў выпадку пропуску такога тэрміну па ўважлівай прычыне (цяжкая хвароба, працяглая камандзіроўка і інш.).

**<u>Тэрмін разгляду адміністрацыйнай скаргі</u>**

Адміністрацыйная скарга разглядаецца ў месячны тэрмін з дня яе падачы. Заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах могуць быць прадугледжаны скарочаныя тэрміны разгляду адміністрацыйных скарг.